23 ЛЮТАГА
1938 г.
№ 2-3 (54-55)

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

ОРГАН
парткома,
прафкома
і рэктарыята
Беларускага
дзяржаўнага
універсітэта

XX ГОД РСЧА І ЧЫРВОНАГА ФЛОТА

Дваццаць год таму назад, пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, большэвіцкая партыя і Совецкая ўлада стварылі першую ў свеце армію соцыялістычнай рэволюцыі—Чырвоную Армію рабочых і сялян.

Пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў Чырвоная Армія на франтах грамадзянскай вайны ўшчэнт разбіла полчышчы інтэрвентаў. Германскія, японскія, французскія, англійскія імперыялісты атрымалі сакрушальны ўдар штыхоў Чырвонай Арміі. Ленін і Сталін былі непасрэднымі арганізатарамі і кіраўнікамі баявых аперацый Чырвонай Арміі.

Чырвоная Армія перамагла таму, што яе задачы і мэты—гэта былі задачы і мэты ўсяго працоўнага народа. «Мы атрымалі перамогу таму, што мы былі і маглі быць адзінымі» (Ленін). Чырвоная Армія і народ ведаў, што ён змагаецца за сваё вызваленне ад ярма каніталізма.

Чырвоная Армія перамагла таму, што яе стварыла, ёю кіравала комуністычная партыя, што ў рады арміі партыя накіроўвала лепшых сваіх сыноў. Партыя выгнала з Чырвонай Арміі ворагаў народа—трацкістаў і іх правых пасобнікаў.

Семнаццаць год, як наша краіна жыве мірна. Вялікія змены адбыліся за гэты час. У нас пабудован соцыялізм. Наша краіна стала краінай самай буйнай у свеце прамысловасці і сельскай гаспадаркі. З слабай краіны Совецкі Саюз стаў магутны, гатовы даць адпор усім тым, хто паспрабуе напасці на нас. Наша Чырвоная Армія вырасла і стала моцнай. Мы стварылі для абароны нашых граніц магутнейшы Ваенна-Марскі Флот.

Вялікая роля і заслуга ў стварэнні і ўмацаванні Чырвонай Арміі таварыша Сталіна. На франтах грамадзянскай вайны супроць Дзенікіна, Калчака, Юдзеніча, Врангеля, белапалякаў і т. д. Усюды, дзе толькі з'яўляўся таварыш Сталін, Чырвоная Армія перамагала.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна працавалі яго саратнікі і вучні: таварышы Варашылаў, Орджанікідзе, Кіраў, Фрунзе, Будзённы.

Героі грамадзянскай вайны—Чапаеў, Шчорс, Катоўскі і другія—вечна будуць жыць у сэрцах працоўных, з'яўляючыся прыкладам гераізма і адданасці ў барацьбе за соцыялістычную радзіму ў будучых баях з капіталам.

Мы добра ведаем, што нас акружаюць капіталістычныя дзяржавы, якія рыхтуюцца напасці на першую ў свеце краіну соцыялізма. І пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, мы павінны ўзмацняць нашу Чырвоную Армію, Ваенна-Марскі Флот, узмацняць абароназдольнасць совецкага народа.

З вялікім гонарам мы сустракаем дваццатую гадавіну РСЧА і Ваенна-Марскога Флота. Мы ганарымся за сваю непераможную Чырвоную Армію, гатовую на ўдар адказаць самым сакрушальным ударам таму, хто пасмее нарушыць наша мірнае будаўніцтва соцыялізма. Гарантыя міру і далейшых поспехаў—ёсць наша магутная, непераможная Чырвоная Армія.

Няхай жыве XX гадавіна РСЧА і Ваенна-Марскога Флота!

І. СТАЛІН

Аб трох асаблівасцях Чырвонай Арміі

(Прамова на ўрачыстым пленуме Маскоўскага Совета, прысвечаным дзесятай гадавіне Чырвонай Арміі)

Таварышы, дазвольце вітаць ад імя Цэнтральнага Камітэта нашай партыі байцоў нашай Чырвонай Арміі, байцоў нашага Чырвонага Флота, байцоў нашай Чырвонай Авіяцыі, нарэшце, нашых дапрызыўнікаў, узброеных рабочых СССР.

Партыя ганарыцца, што ёй удалося стварыць з дапамогай рабочых і сялян першую ў свеце Чырвоную Армію, якая ў найвялікшых баях адстайвала і адстаяла свабоду рабочых і сялян.

Партыя ганарыцца, што Чырвонай Арміі ўдалося з гонарам прайсці цяжкі шлях найжорсткіх баёў з унутранымі і знешнімі ворагамі рабочага класа і сялянства нашай краіны, што ёй удалося аформіцца ў найвялікшую баявую рэволюцыйную сілу на страх ворагам рабочага класа, на радасць усім прыгнечаным і падняволеным.

Партыя ганарыцца, што Чырвоная Армія, прайшоўшы доўгі шлях вызвалення рабочых і сялян ад ярма памешчыкаў і капіталістаў, заваявала, нарэшце, сабе права святкаваць свой юбілей на дзесятым годзе свайго нараджэння.

Таварышы, у чым сіла, дзе крыніцы сілы нашай Чырвонай Арміі?

У чым заключаюцца тыя асаблівасці, якія карэнным чынам адрозніваюць нашу Чырвоную Армію ад усіх і ўсякіх армій, калі-небудзь існаваўшых у свеце. У чым тыя асаблівасці, якія складаюць крыніцу сілы і магутнасці нашай Чырвонай Арміі?

Першая і асноўная асаблівасць нашай Чырвонай Арміі заключаецца ў тым, што яна ёсць армія вызваленых рабочых і сялян, яна ёсць армія Кастрычніцкай рэволюцыі, армія дыктатуры пролетарыята. Усе дагэтуль існаваўшыя арміі, які-б яны ні мелі састаў, з'яўляюцца арміямі зацверджання ўлады капітала. Яны былі і асталіся арміямі панавання капітала. Буржуа ўсіх краін хлусяць, калі гавораць, што армія палітычна нейтральна. Няверна гэта. У буржуазных дзяржавах армія пазбаўлена палітычных правоў, яна адхілена ад палітычнай арэны, гэта верна. Але гэта зусім не значыць, што яна нейтральна палітычна. Наадварот, заўсёды і ўсюды, ва ўсіх капіталістычных краінах армія ўцягвалася і ўцягваецца ў палітычную барацьбу, служачы зброяй падаўлення рабочых. Хіба гэта няверна, што армія падаўляе там рабочых, што яна служыць там аплотам паноў? У адрозненне ад такіх армій, наша Чырвоная Армія мае тую асаблівасць, што яна з'яўляецца зброяй зацверджання ўлады рабочых і сялян, зброяй зацверджання дыктатуры пролетарыята, зброяй вызвалення рабочых і сялян ад ярма памешчыкаў і капіталістаў. Наша армія ёсць армія вызвалення працоўных.

Ці звярнулі вы ўвагу, таварышы, што ў стары час, ды і цяпер у капіталістычных краінах народ баяўся і прадаўжае баяцца арміі, што паміж народам і арміяй існуе перашкода, якая адгароджвае армію ад народа. Ну, а ў нас? У нас наадварот, народ і армія складаюць адно цэлае, адну сям'ю. Нідзе ў свеце няма такіх любоўных і клапатлівых адносін з боку народа да арміі, як у нас. У нас армію любяць, яе паважаюць, аб ёй клапоцяцца. Чаму? Таму, што ўпершыню ў свеце рабочыя і сяляне стварылі сваю ўласную армію, якая служыць не панам, а былым рабам, цяпер вызваленым рабочым і сялянам.

Вось дзе крыніца сілы нашай Чырвонай Арміі.

А што значыць любоў народа да сваёй арміі? Гэта значыць, што такая армія будзе мець мацнейшы тыл, што такая армія з'яуляецца непераможнай. Што такое армія без моцнага тылу? Нішто. Самыя вялікія арміі, самыя ўзброеныя арміі развальваліся і ператвараліся ў прах без моцнага тылу, без падтрымання і спачування з боку тылу, з боку працоўнага насельніцтва. Наша армія ёсць адзіная ў свеце, якая мае спачуванне і падтрыманне з боку рабочых і сялян. У гэтым яе сіла, у гэтым яе моц.

Вось чым, перш за ўсё, наша Чырвоная Армія адрозніваецца ад усякіх іншых армій, існаваўшых і існуючых у свеце.

Пажаданні партыі, яе задача заключаецца ў тым, каб гэта асаблівасць Чырвонай Арміі, гэта яе блізасць, яе брацкая сувязь з рабочымі і сялянамі, была захавана і замацавана за нашай Чырвонай Арміяй.

Другая асаблівасць нашай Чырвонай Арміі заключаецца ў тым, што яна, наша армія, з'яўляецца арміяй брацтва паміж народамі нашай краіны, арміяй вызвалення прыгнечаных народаў нашай краіны, арміяй абароны свабоды і незалежнасці народаў нашай краіны. У стары час звычайна арміі выхоўваліся ў духу шавінізма, у духу захватніцтва, у духу неабходнасці паднявольваць чужыя народы. Гэтым уласна і тлумачыцца, што арміі старога тыпу, арміі капіталістычныя былі разам з тым арміямі каланіяльнымі. У гэтым заключалася адна з асноўных слабасцей старых армій. Наша армія карэнным чынам адрозніваецца ад каланіяльных армій. Уся яе сутнасць, увесь яе лад грунтуюцца на ўмацаванні уз дружбы паміж народамі нашай краіны, на ідэі вызвалення прыгнечаных народаў, на ідэі абароны свабоды і незалежнасці соцыялістычных рэспублік, уваходзячых у склад Совецкага Саюза.

У гэтым другая і асноўная крыніца сілы і магутнасці нашай Чырвонай Арміі. У гэтым зарука таго, што наша армія ў крытычную хвіліну знойдзе

(Працяг на 3 стар.)

НІКАМУ ЗЯМЛІ СОВЕЦКАЙ МЫ НІ ПЯДЗІ НЕ ДАДЗІМ!

Уся наша неабсяжная соцыялістычная радзіма з вялікай радасцю сустракае XX гадавіну слаўнай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Свята Чырвонай Арміі з'яўляецца святам усяго совецкага народа. Увесь шматмільённы наш народ горача любіць сваю Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і свой Ваенна-Марскі Флот.

Совецкі народ, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, на чале з вялікім Сталіным будзе і надалей прыкладаць усе сілы, каб наша Чырвоная Армія была яшчэ больш магутнай.

Совецкі народ цвёрда ўпэўнан, што «Калі падпальшчыкі вайны адважацца напасці на Совецкі Саюз, Чырвоная Армія і Флот абрушаць на ворага ўсю сілу сваёй тэхнікі, усю магутнасць сваёй арганізацыі, усю згуртаванасць сваіх жалезных батальёнаў, уввсь свой гераізм, каб знішчыць ворага на яго тэрыторыі». (З тэзісаў да 20-годдзя РСЧА і Ваенна-Марскога Флота).

Беларускі народ, як і ўсе народы СССР, у сваіх песнях славіць сваю горача любімую Чырвоную Армію. Любоўю і адданасцю да РСЧА гучыць кожны радок друкуемай ніжэй народнай творчасці шчаслівага беларускага народа.

ЦЕРАЗ ГОРЫ І ДАЛІНЫ

Цераз горы і даліны
Уцякалі белыя,
Усіх бандытаў мы разбілі
Па загаду Леніна.
Мы разбілі ўсіх бандытаў,
Разграмілі на франтах,
Бо да гэтага нас клікаў
Смелы голас Ільіча.
Жыць мы вольна, дружна сталі,
Ліхадзеем не прайсці
Нас вядзе таварыш Сталін
Ды па ленінскім пуці.
Хай махне рукою Сталін,
Хай нам скажа маршал Клім,
Будзем біцца мы і шчасце
Нікаму не аддадзім.

Даручыў нам Варашылаў
Берагчы совецкі край...
І ты, вораг, кулі меткай
Паспытаеш, гэта знай.
Наша армія магутна,
На чале — таварыш Клім.
Узмацняйся, наша ўлада,
Мы граніцы даглядзім.
Гаварылі бацька й маці,
Гаварыў старэйшы брат,
Што ад Менска Варашылаў
У Совеце дэпутат.
Нам так радасна штодзённа,
Бельмі добра цяпер жыць.
— Добры дзень, маршал Будзённы,
Еду ў конніцу служыць!..

СОНЦА ГРЭЕ, ВЕЦЕР ВЕЕ...

Сонца грэе, вецер вее,
Песня разліваецца.
Мой міленькі, даражэнькі
У Армію збіраецца.

Пасадзіла пад акном я
Бярозку зялёную.
Едзе, едзе не ў салдаты —
У Армію Чырвоную.

Рада маці, рад і бацька,
На граніцу сын ідзе.

— Ды глядзі-ж, сынок мой мілы,
Стой там моцна, як нідзе

Не пускай на зямлю нагу
Фашыстаў—ворагаў ліхіх.
Варашылаву перадай, сы
Прывітанне ад радных.

Сонца грэе, вецер вее,
Песня разлізалася
З сваім міленькім дружком
У той дзень развіталася.

НАВУЧЫЎ НАС ВАРАШЫЛАЎ...

А ў кузні ў калгаснай
Там каваль працуе
І з найлепшай сталі штых
Ён сабе гартуе.

— Хай пасмее вораг крануць —
Каваль смела кажа, —
Не дайшоўшы да граніц,
Ён у яму ляжа.

Бо навучыў нас Варашылаў,
Як з ворагам біцца,
Каб той вораг не дайшоў
Да нашай зямліцы.

НА МЯЖЫ СОВЕЦКАЙ

Накрыла ночка цёмная
Шырокія палі,
На мяжы совецкай
Стаіць вартавы.

З усхода і захада
Рыхтуецца паход
На вольную краіну,
На мірны наш народ.

Нас гэта не палохае,
Гатовы мы ў бой,
За наша жыццё светлае,
За край шчаслівы свой.

Прыезд І. В. Сталіна ў Першую Конную Армію ў снежні 1919 г.

«ТРЭБА УСЯМЕРНА УЗМАЦНЯЦЬ І УМАЦОЎВАЦЬ НАШУ ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ, ЧЫРВОНЫ ФЛОТ, ЧЫРВОНУЮ АВІЯЦЫЮ, АСОАВІЯХІМ. ТРЭБА УВЕСЬ НАШ НАРОД ТРЫМАЦЬ У СТАНЕ МАБІЛІЗАЦЫЙНАЙ ГАТОЎНАСЦІ ПЕРАД ТВАРАМ НЕБЯСПЕКІ ВАЕННАГА НАПАДУ, КАБ НІЯКАЯ «ВЫПАДКОВАСЦЬ» І НІЯКІЯ ФОКУСЫ НАШЫХ ЗНЕШНІХ ВОРАГАЎ НЕ МАГЛІ ЗАСЦІГНУЦЬ НАС ЗНЯНАЦКУ...» (СТАЛІН).

УЗМАЦНІМ АБАРОННУЮ РАБОТУ

Кожны год Асоавіяхім выпускае дзесяткі тысяч варашылаўскіх стралкоў, нашы аэраклубы рыхтуюць смелых і бясстрашных лётчыкаў і парашутыстаў. Чырвоны Крыж выпускае вялікую армію значкістаў ГСА—мужных чырвоных сясцёр—усе яны па закліку партыі і ўрада ў любую мінуту гатовы выступіць са зброяй у руках і груддзю адстойваць заваяванні Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Ніякім ворагам соцыялізма не ўдасца астанавіць вялікае шэсце соцыялізма. Партыя разграміла банды гестапо, якія арудвалі ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, якія асабліва імкнуліся ў мінуўшы 1937 год разлажыць нашу доблесную Чырвоную Армію і наш Ваенна-Марскі Флот. Знічаны шпіёны, якія прабраліся было ў асоавіяхімаўскія арганізацыі і якія імкнуліся зрываць абаронную работу. Ворагі народа не прамінулі і ваш універсітэт. Работу ваеннай кафедры ўзначальваў вораг народа. Ён усякімі мерамі імкнуўся зрываць абаронную работу ва універсітэце.

Але, не гледзячы на гэта, ваша асоавіяхімаўская арганізацыя пры дапамозе партыйнага і комсамольскага калітэтаў падрыхтавала значкістаў ННХА II ступені 10 чалавек, ГСА 1 ступені 30 і II ступені 20, ВС II ступені 7 чалавек. Былі праведзены стралковыя міжфакультэцкія і гарадскія спаборніцтвы, дзе БДУ заняў першае месца. У гарадскіх лыжных спаборніцтвах на буксіры за аўтамашынай каманда БДУ з 3 чалавек заняла першае месца.

Зараз 60 студэнтаў універсітэта вывучаюць аўтамашыну і 65 чалавек матацыкл, з якіх добра водзяць матацыкл 7 чалавек. Асабліва вылучаюцца ў гэтым студэнты Урбановіч і Вітворчык. Да дня 20-й гадавіны РСЧА 7 студэнтаў атрымаюць права вадзіць матацыкл. Падрыхтаван 31 інструктар ППХА, якія будуць скарыстаны ва універсітэце для кіраўніцтва групамі самаабароны. Праведзена пераатэстацыя 50 проц. інструктараў ППХА. Арганізаван гурток на 40 чалавек па вывучэнню радыё. Праведзены стралковыя спаборніцтвы, якія далі добрыя паказчыкі.

У другім паўгоддзі мы павінны дабіцца, каб ва універсітэце абаронная работа была разгорнута ў масавым маштабе, бо вынікі работы за першае паўгоддзе нас не могуць задаволіць. БДУ павінен стаць крэпасцю абароны. Абаронную работу мы павінны ўмацоўваць з дня ў дзень, ні ў якім разе не забываючы аб капіталістычным акружэнні. Разам з Чырвонай Арміяй будзем граміць ворага на яго тэрыторыі.

КАВАЛЕВІЧ.

АБАРОННЫЯ ЧАСТУШКІ

Праважала я мілога,
Гаварыла: «Не тужы,
У дазоры на граніцы
Пільна край наш беражы».

Няхай бесяцца фашысты,
Не таптаць ім нашых ніў.
Аб такім жыцці, што маем,
З нас ніхто раней не сніў.

***

На зямлю Советаў лезлі
То бандыт, то генерал.
Мы па сталінскаму плану
Білі белых напавал.

Нікаму зямлі совецкай
Мы ні пядзі не дадзім:
На чале палкоў чырвоных —
Наш нарком жалезны Клім.

***

Зацвіла ігруша,
Зацвіла і сліва.
Мы ў краіне сваёй
Зажылі шчасліва.

Маем танкі, маем пушкі,
Маем чым фашыстаў біць.
Як ударым з самалётаў,
Дык паветра задрыжыць.

Мы зямлі чужой не хочам
І сваёй не аддадзім.
За сваю маці-радзіму
Усе гарою пастаім.

***

Слава Арміі Чырвонай
І табе, наш родны Клім,
У барацьбе за перамогу
Мы жыццё ўсё аддадзім.

Мы вайны зусім не хочам,
Свае межы беражом.
І хай вораг зуб не точа
На совецкі агарод.

Самалёты будуць з неба
Усіх буржуяў метка біць,
Калі толькі будзе трэба
Край совецкі бараніць.



На занятках па вывучэнню матацыкла

ПРАЦЯГ ПРАМОВЫ таварыша СТАЛІНА

найвялікшае падтрыманне ў мільённых масах усіх і ўсякіх нацыянальнасцей, насяляючых нашу неабсяжную краіну.

Пажаданні партыі, яе задача заключаецца ў тым, каб гэта асаблівасць таксама была захавала і замацавана за нашай Чырвонай Арміяй.

Нарэшце, трэцяя асаблівасць Чырвонай Арміі. Заключаецца яна ў духу інтэрнацыяналізма, у пачуццях інтэрнацыяналізма, якія прасякаюць усю нашу Чырвоную Армію. У капіталістычных краінах арміі звычайна выхоўваюцца ў духу нянавісці да іншых народаў, у духу нянавісці да іншых дзяржаў, у духу нянавісці да рабочых і сялян іншых краін. Для чаго гэта робіцца? Для таго, каб ператварыць армію ў паслухмянае стада ў выпадку ваенных сутычак паміж дзяржавамі, паміж краінамі. У гэтым крыніца слабасці ўсіх капіталістычных армій. Наша армія пабудавана на зусім іншых падставах. Сіла нашай Чырвонай Арміі, таварышы, заключаецца ў тым, што яна выхоўваецца з першага-ж дня свайго параджэння ў духу інтэрнацыяналізма, у духу павагі да іншых народаў, у духу любві і павагі да рабочых усіх краін, у духу захавання і зацвярджання міру паміж краінамі. І іменна таму, што наша армія выхоўваецца ў духу інтэрнацыяналізма, у духу адзінства інтарэсаў рабочых усіх краін, іменна таму яна, наша армія, з'яўляецца арміяй сусветнай рэволюцыі, арміяй рабочых усіх краін. І тое, што гэта акалічнасць з'яўляецца крыніцай сілы і магутнасці нашай арміі, аб гэтым даведаюцца калі-небудзь буржуа ўсіх краін, калі яны адважацца напасці на нашу краіну, бо яны ўбачаць тады, што наша Чырвоная Армія, выхаваная ў духу інтэрнацыяналізма, мае безлічную колькасць прыяцеляў і саюзнікаў ва ўсіх частках свету, ад Шанхая да Нью-Ёрка, ад Лондана да Калькуты.

Вось, таварышы, трэцяя асноўная асаблівасць, якая прасякае дух нашай арміі і стварае крыніцу яе сілы і магутнасці.

Пажаданні партыі, яе задача заключаецца ў тым, каб гэта асаблівасць таксама была захавана і замацавана за нашай арміяй.

Гэтым тром асаблівасцям абавязана наша армія тым, што яна ведае, куды ідзе,—тым, што яна складаецца не з алавяных салдат, а з людзей свядомых, разумеючых, куды ісці і за што біцца.

Але армія, ведаючая, за што яна змагаецца, непераможна, таварышы.

Вось чаму наша Чырвоная Армія мае ўсе падставы быць лепшай у свеце арміяй.

Няхай жыве наша Чырвоная Армія!

Няхай жывуць яе байцы!

Няхай жывуць яе кіраўнікі!

Няхай жыве дыктатура пралетарыята, якая нарадзіла Чырвоную Армію, дала ёй перамогу і ўвянчала яе славай!

(Бурныя, працяжныя апладысменты).

РАШУЧА ВЫПРАВІМ ПАМЫЛКІ!

Самастрахоўшчыкі з парткома

«Пара выкрыць такіх, з дазволу сказаць, комуністаў і закляйміць іх, як кар'ерыстаў, якія стараюцца выслужыцца па выключэннях з партыі, стараюцца перастрахавацца пры дапамозе рэпрэсій супроць членаў партыі» — так гаворыцца ў гістарычнай пастанове студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б). Здавалася-б, што партыйная арганізацыя універсітэта павінна была-б ны абмеркаванні рашэння Пленума ЦК ВКП(б) выявіць усе факты перастрахоўкі і саміх перастрахоўшчыкаў. Аднак, апошні партыйны сход гэтага не зрабіў. На пасяджэнні парткома быў выключан з членаў партыі тав. Арашкевіч толькі за тое, што ён не з'явіўся на сход профсаюзнай арганізацыі. Але ні сакратар парткома тав. Одзінец, ні член парткома Цоір, Мільман не сказалі на сходзе, што гэта было зусім няправільнае рашэнне, што гэта проста—перастрахоўка. А там, дзе патрэбна было выключыць сапраўднага ворага народа, там партком не праявіў дастатковай пільнасці. І пасля, каб нагнаць «упушчанае» партком выключае з партыі тых комуністаў, якія гэтага не заслугоўваюць (справа тав. Гельфанда).

Могуць сказаць, што гэтыя справы разглядаліся да рашэння Пленума ЦК ВКП(б), і асобныя памылкі маглі мець месца. Але справа не ў асобных памылках. Справа ў сістэме работы нашага парткома, справа ў тым, што ён выключаў чэсных комуністаў з партыі, чым наносіў вялікую шкоду партыі.

Вывады ясны. Каментарыі непатрэбны.

І. ЛЕВІН.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ АЖЫЦЦЯВІЦЬ РАШЭННІ ПЛЕНУМА

Рашэнне Пленума ЦК ВКП(б) «Аб памылках партарганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з ВКП(б) і аб мерах па ўстраненню гэтых недахопаў» з'яўляецца праграмным дакументам кожнай партарганізацыі і для кожнага комуніста ў паасобку. Усе тое, што гаворыцца ў пастанове Пленума аб фармальна-бюракратычных адносінах да выключэння з партыі і да апеляцый выключаных з ВКП(б), мела месца і ў нашай партарганізацыі.

Мы маем многа выпадкаў няправільнага, несур'ёзнага і нячуткага падыходу да разбору спраў асобных членаў партыі.

У партыйным камітэце ўкаранілася такая практыка, што разбор асобных спраў цягнуўся па 4 — 5 месяцаў (Краўцоў, Прэчыц) і др.

Многа матэрыялаў даручалася правяраць людзям, якія не зусім кампетэнтны былі ў даручанай справе, а партком у цэлым і сакратар парткома тав. Одзінец не давалі напрамку як весці тую ці іншую справу.

Рашэнне Пленума ЦК ВКП(б) узбройвае нас на выкрыццё ворагаў, мабілізоўвае на павышэнне большэвіцкай пільнасці і на разгортванне крытыкі і самакрытыкі.

Рашэнне студзеньскага Пленума не ў меншай меры адносіцца і да комсамольскай арганізацыі. Трэба сказаць, што ў КСМ мы маем рад фактаў бязглушных адносін да людзей, калі выключалі пачкамі комсамольцаў без разбору і індывідуальнага падыходу. Комсамольцы Зальцман (фізмат), Петровіч (хімфак), Сакаў (гістфак) і іншыя былі выключаны беспадстаўна, без належных фактаў і іх праверкі.

Камітэт комсамола і РК КСМ таксама бяздушна адносяцца да канфліктных спраў комсамольцаў, зацягваючы разбор іх на 3—5 месяцаў (Туміловіч, Мільгуй, Шаліма, Петровіч).

Справа комсамольца Астапенкі (гістфак), якая па сутнасці была паклёпніцкай, таксама цягнулася каля 4 месяцаў, і толькі зараз тав. Астапенка рэабілітаван і адноўлен зноў прапагандыстам.

Партыйная арганізацыя, а таксама і комсамольская павінны перабудаваць сваю работу ў напрамку рашэння студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б), хутчэй і сур'езней падыходзіць да разбору ўсіх спраў, бо за кожнай справай стаяць жывыя людзі. Трэба неадкладна выправіць усе дапушчаныя памылкі.

Д. МІЛЬМАН.

Нізкі ўзровень крытыкі

Па апошнім агульным партыйным сходзе абмяркоўвалася гістарычнае рашэнне студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б). У свеце рашэння студзеньскага Пленума ўзровень крытыкі агульнага партыйнага схода быў зусім нізкім. Перш за ўсе, зусім недастаткова была самакрытыка з боку сакратара партыйнага камітэта тав. Одзінца.

Тав. Одзінец абмежаваўся тым, што, моў, партком не заусёды правільна падыходзіў да разбору спраў асобных комуністаў. Разбор спраў зацягваўся на доўгія тэрміны. Тав. Одзінец не сказаў, чаму партком шаблонна падыходзіў да разбору некаторых спраў, што садзейнічала няправільнаму іх рашэнню і т. д. А можна было прывесці цэлы рад прыкладаў няправільнага разгляду спраў на комуністаў (Цішкевіч і др.). Сакратару парткома патрэбна было расказаць пра ўсё гэта партсходу, але тав. Одзінец дыпламатычна ўмаўчаў. Баязнь крытыкі, самастрахоўка, замазванне сваіх памылак і памылак парткома—не далі магчымасці аб гэтым гаварыць.

Некаторыя члены парткома (Цоір, Мільман) у сваіх выступленнях абмежаваліся агульнымі словамі, у іх выступленні самакрытыкі не было. Чаму сакратар і члены парткома нічога не сказалі аб тым, што перашкаджала своечасоваму разбору кампраметацыйных матэрыялаў, паданых на асобных таварышоў.

Усе гэтыя пытанні з боку партыйнага схода не атрымалі абмеркавання.

АНДРУШЧАНКА.

Выкрыць паклёпнікаў і кар'ерыстаў

ЦК ВКП(б) не раз патрабаваў ад партыйных арганізацый уважлівых адносін да лёсу комуністаў пры рашэнні пытання аб выключэнні іх з радоў партыі.

Студзеньскі Пленум ЦК ВКП(б) яшчэ раз рашуча асудзіў практыку фармальных бяздушна-бюракратычных адносін да пытання аб лёсе асобных членаў партыі. Пленум ЦК у сваёй пастанове запісаў:

«Пара зразумець, што большэвіцкая пільнасць не толькі не выключае, а наадварот прадпалагае ўменне праяўляць максімум асцярожнасці і таварыскіх клопатаў пры рашэннях пытанняў аб выключэнні з партыі або аб аднаўленні выключаных у правах членаў партыі».

Гэта пастанова Пленума ЦК у поўнай меры адносіцца і да комсамольскіх арганізацый. І ў комсамоле мелі месца фармальныя, бяздушна-бюракратычныя адносіны да лёсу асобных комсамольцаў. Асобныя кар'ерысты-комсамольцы стараліся нажыць сабе палітычны капітал на выключэннях з комсамола, на спагнаннях комсамольцам і гэтым застрахаваць сябе ад магчымых абвінавачванняў у недахопе пільнасці.

Адначасова з той вялікай работай, якую правяла комсамольская арганізацыя універсітэта па ачышчэнню сваіх радоў ад ворагаў і іх пасобнікаў, мелися факты выключэння з радоў комсамола, вынясення суровых спагнанняў па неправераных, а часта і па яўна паклёпніцкіх матэрыялах. Камітэт комсамола часамі без дастатковай праверкі, без індывідуальнага, чулага падыходу выключаў з комсамола, выносіў суровае спагнанне ні ў чым не павінным таварышам.

Так, напрыклад, на гістарычным факультэце быў выключан з комсамола і назван пасобнікам трацкістаў, студэнт 1 курса гістфака Сакаў толькі за тое, што ён на лекцыі Канстытуцыі задаў выкладчыку няяснае яму пытанне ао магчымасці пабудовы комунізма ў адной краіне.

Комсамолка Зальцман (фізмат) была паклёпніцка абвінавачана ў падтрыманні ворага народа і выключана з комсамола, у той час, як яна выкрывала гэтага ворага.

Канапелькіна (студэнтка геафака) была абвінавачана ў прытупленні пільнасці да ворага народа, і комсамольскі камітэт вынес ёй суровае спагнанне толькі за тое, што яна некалькі месяцаў займала кватэру ў доме, дзе быў выкрыт вораг народа.

Астапенка (студэнт IV курса гістфака) быў абвінавачан у прытупленні пільнасці да ворага народа, яго знялі з прапагандыстаў, вынеслі спагнанне, у той час, як Астапенка ўсяго некалькі раз заходзіў па справах вучобы на кватэру да студэнта, які аказаўся ворагам народа.

Тамашова (студэнтка гістфака) камітэт комсамола з мэтай самастрахоўкі за нязначны праступак выключыў з комсамола, у той час, як дастаткова было абмежавацца спагнаннем.

Асобныя кар'ерысты-комсамольцы нашай арганізацыі шляхам падачы паклёпніцкіх матэрыялаў на чэсных комсамольцаў імкнуліся нажыць сабе палітычны капітал. Так, напрыклад, комсамолец геафака Марголін падаў дзесяткі нічым неабгрунтаваных паклёпніцкіх заяў на чэсных комуністаў і комсамольцаў, абвінавачваючы іх у варожай дзейнасці або сувязі з ворагамі народа.

Розенгауз (студэнт гістфака) не раз беспадстаўна паклёпнічаў, абвінавачваў у варожай дзейнасці комуніста Камінскага.

Аднак гэтыя паклёпнікі-кар'ерысты Марголін, Розенгауз і др. да гэтага часу не прыцягнуты да адказнасці.

Комсамольцы на агульным сходзе, які адбыўся 17 лютага, падверглі рэзкай крытыцы меўшыя месца памылкі і недахопы ў рабоце комсамольскага камітэта.

Выступаўшыя таварышы адзначалі, што выкрытыя ворагі народа, якія знаходзіліся ў былым кіраўніцтве універсітэта, прыбягалі да метадаў правакацый і паклёпу на асобных членаў партыі і комсамольцаў, выкарыстоўвалі для гэтай мэты агульныя сходы і друк. Так, напрыклад, па гістарычным факультэце вораг народа, які быў рэдактарам факультэцкай газеты, правакацыйна абвінавачваў у варожай дзейнасці дзесятак чэсных комуністаў і комсамольцаў. Аднак, да гэтага часу газета гістфака (рэдактар Бірылка) не змясціла абвяргаючага матэрыяла і зараз працягвае паклёпнічаць і выражаць палітычнае недавер'е чэсным таварышам. Яна безгрунтоўна імкнулася вывесці з састава рэдкалегіі факультэта комсамольца Герасімава, адштурхнула яго ад работы ў газеце на падставе неправераной паклёпніцкай заявы Багалюбава, які абвінавачваў Герасімава, быццам ён паходзіць з класава-варожай сям'і.

Абмеркаваўшы гэтыя пытанні, комсамольскі сход прапанаваў камітэту перагледзець справы выключаных з комсамола і атрымаўшых спагнанне комсамольцаў па не праверэных і паклёпніцкіх абвінавачваннях, прыцягнуць да суровай адказнасці ўсіх паклёпнікаў і кар'ерыстаў.

Агульны сход абавязаў комсамольцаў, якія з'яўляюцца членамі рэдкалегій універсітэцкіх газет, дабіцца змяшчэння ў іх матэрыялаў, абвяргаючых паклёпніцкія абвінавачванні чэсных таварышаў. Комсамольцы адзначылі, што гэтыя мерапрыемствы дапамогуць узмацніць рэволюцыйную пільнасць у барацьбе супроць сапраўдных ворагаў народа.

Вас. ФОМІН.

ЛІКВІДАВАЦЬ НЕДАХОПЫ

Закончыўся першы семестр. Студэнты I курса гістарычнага факультэта ўпершыню ў жыцці здавалі залікі ў вышэйшай навучальнай установе.

У першым семестры можна было ясна бачыць тыя асобныя недахопы, якія мелі месца на I курсе і якія далі сябе адчуваць і могуць яшчэ больш адбіцца на глыбіне ведаў студэнтаў. Да ліку такіх недахопаў трэба аднесці адсутнасць праграм па цэламу раду курсаў. У пачатку навучальнага года мы зусім не мелі праграм па ўсіх дысцыплінах. І толькі к канцу першага семестра, перад самымі залікамі студэнты атрымалі праграмы толькі па двух чытаных курсах.

І зараз, не гледзячы на тое, што курс палітэканоміі чытаецца з пачатку вучэбнага года, студэнты атрымалі праграмы толькі тады, калі ўжо большая палова курса прачытана. Да гэтага часу дэканат не забяспечыў студэнтаў праграмамі па гісторыі Грэцыі і Рыма, гісторыі Усхода, гісторыі Беларусі і інш. Курс гісторыі Усхода ў першым паўгоддзі амаль не чытаўся, а зараз пачалася гонка, што значна адаб'ецца на якасці ведаў студэнтаў. Веданне-ж гісторыі Усхода неабходна студэнтам пры вывучэнні гісторыі Рыма і Грэцыі.

Вядома, што студэнты I курса—гэта людзі, якія яшчэ не заўсёды самастойна могуць працаваць над кнігай, тым больш над гістарычным матэрыялам. Патрэбна вялікая дапамога ў гэтай справе, асабліва абмен вопытам работы з выдатнікамі вучобы старэйшых курсаў. Таксама добра было-б арганізаваць лекцыі па пытанню аб рабоце над кнігай. Тройчы дэканат і профкамітэт гістфака рабілі спробу сабраць студэнтаў першых курсаў з выдатнікамі старэйшых курсаў, але спроба асталася толькі спробай.

На I курсе зусім адсутнічае спаборніцтва. Гэтым пытаннем зусім не займаюцца ні дэканат гістфака, ні профкамітэт.

Усе гэтыя недахопы патрэбна неадкладна ліквідаваць. Трэба забяспечыць усіх студэнтаў праграмамі, арганізаваць соцыялістычнае спаборніцтва, арганізаваць абмен вопытам студэнтаў старэйшых курсаў з першым курсам, а таксама правесці рад лекцый на тэму «Як працаваць над кнігай па гісторыі». Усё гэта ўзніме якасць вучобы і павысіць веды студэнтаў.

Студэнт I курса гістфака.
СОКАЛ.

Аб дысцыпліне

Свядомая дысцыпліна з'яўляецца залогам выканання ўсіх мерапрыемстваў нашай соцыялістычнай гаспадаркі. Без гэтага зусім немагчыма праводзіць ні адно важнае мерапрыемства.

Недысцыплінаванасць у ВНУ заўседы вядзе к дэзарганізацыі вучэбнага працэса, зрыву і невыкананню вучэбнага плана.

Недысцыплінаванасць ніяк не сумяшчаецца, а, наадварот, супярэчыць укараненню соцыялістычных форм працы.

Аднак, не гледзячы на ўсё гэта, дысцыпліна ў нашым універсітэце адсутнічае як сярод студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкага састава, так і сярод адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў. Зусім недапушчальным з'яўляецца той факт, што на заняткі пасля зімовых канікул па універсітэту спазнілася на некалькі дзён 120 чалавек. З іх найбольш выдзяляюцца тт. Гуткіна (спазнілася на 5 дзён), Скараход і Балоба (на 4 дні). Акрамя таго, каля 100 чалавек з тых, якія своечасова прыехалі, ужо прапусцілі па некалькі гадзін занятак. Прычыны спазнення у большасці студэнтаў зусім няўважлівыя: «Спазніўся к поезду», «Адчуваў сябе ўсталым», «Дастаў білет у тэатр у Маскве», «Трэба было нарыхтаваць дроў бацькам» і т. д. З гутаркі з гэтымі студэнтамі ствараецца ўражанне, што вельмі многія не бачаць у недысцыплінаванасці нічога дрэннага, лічаць гэта звычайнай справай.

У БДУ маюць месца хуліганскія ўчынкі з боку студэнтаў, як напрыклад, драка ў бібліятэцы, п'янства ў інтэрнаце і пасля гэтага драка, грубыя адносіны да прафесарска-выкладчыцкага састава, зневажанне работнікаў тэхнічнага персанала і т. д. Усё гэта гаворыць за тое, што сярод студэнтаў ёсць такія, якія не разумеюць і не жадаюць разумець значэння дысцыпліны. Гэта гаворыць таксама за тое, што сярод студэнтаў прафком і другія грамадскія арганізацыі, а таксама і рэктарыят не праводзяць дастатковай работы за свядомую дысцыпліну.

Дысцыпліна сярод навуковых работнікаў таксама стаіць не на належнай вышыні. Маюць месца зрывы занятак, зусім без усякіх прычын і асабліва частыя спазненні на лекцыі (дацэнт матэматыкі Нісневіч і інш.).

Неабходна сістэматычна праводзіць вялікую растлумачальную работу і пакончыць з недысцыплінаванасцю і расхлябанасцю. Без свядомай дысцыпліны мы не можам паспяхова выканаць наш вучэбны план. Без свядомай дысцыпліны мы не можам паспяхова спраэіцца з асноўнай задачай—падрыхтоўкай высокаквалiфікаваных спецыялістаў. Недысцыплінаванасць тармозіць работу па ліквідацыі рэшткаў шкодніцтва ва універсітэце.

Рэктарыят пры дапамозе грамадскіх арганізацый універсітэта і саміх студэнтаў павінен дабіцца ўстанаўлення свядомай дысцыпліны ва ўсіх звенніх БДУ.

Рэктар універсітэта Бабраўніцкі.

На занятках лыжнай секцыі.

На занятках секцыі бокса.

Маленькі фельетон.

Сход па... загаду

У практыцы работы БДУ бывалі розныя казусы. Нам памятаецца факт, калі аб'яўлялася соцспаборніцтва па загаду, калі адзін з самадураў — рэктар Бладыка—нават выдаў загад: «Назначаю сакратара камітэта комсамола...» Але ніколі ў нас яшчэ не было таго, каб сходы студэнтаў назначаліся загадамі адміністрацыі. Устаноўлена ўжо так, што сходы звычайна збірае профарганізацыя, апавяшчае аб гэтым студэнтаў, праз аб'явы, або проста праформі гавораць у групах: «Сёння ў столькі-та гадзін сход. Яўка абавязкова ўсім».

Усё гэта дэкану гістфака тав. Н'янкову паказалася ўстарэлым і мала аўтарытэтным. Дэкан рашыў зрабіць тут аднаведнае наватарства і належнае ўдасканаленне і рубануў з пляча тонам рэцівага адміністратара:

«19-II—1938 г., у 5 гадзін вечара, у 313 аудыторыі прыродазнаўчага корпуса БДУ адбудзецца агульны сход навуковых работнікаў і студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ. Ваша яўка абавязкова. Дэкан гістарычнага факультэта БДУ П'янкоў».

Сказана чотка і моцна, тонам добрага загада. Толькі шкада, што няма ў дэканаце гербавай пячаткі, а то і яна-б заняла сваё месца тут, поруч з уласнаручным подпісам тав. П'янкова.

У далейшым нараім тав. Н'янкову: няхай ён ленш практыкуе распісвацца на раскладзе і над праграмамі, бо гэты ўчастак найбольш адсталы на гістарычным факультэце і патрабуе неадкладнага ўдасканалення.

Я. ПАУЛОУСКІ.

БАРАЦЬБА ЗА ВЫДАТНУЮ ВУЧОБУ — АБАВЯЗАК КОЖНАГА КОМСАМОЛЬЦА

Зімовая заліковая сесія паказала, што комсамольцы універсітэта дабіліся значна лепшых поспехаў у вучобе, чым у мінулым годзе. На гістарычным факультэце 50 комсамольцаў здалі ўсе прадметы па выдатна. Асабліва добрых паказчыкаў дабілася комсамольская група IV курса (комсорг Куксо), дзе комсамольцы атрымалі 75 проц. выдатных адзнак па ўсіх прадметах. Значна ўзрасла колькасць выдатнікаў. Прыкладам сур'ёзнай работы над сабой на гістфаку могуць быць студэнты: Шаўцоў С. (IV курс), Кучар, Млоцін (III курс), Сендаровіч (I курс) і др. У цэлым па факультэту атрымана 69,3 проц. выдатных адзнак.

Нядрэнных паказчыкаў у вучобе дабілася комсамольская арганізацыя біяфака. Комсамольцы III курса (комсорг Давідовіч) у зімовую заліковую сесію атрымалі 62,8 проц. выдатных адзнак. На біяфаку ёсць рад таварышоў, якія па-сур'ёзнаму працуюць над сабой. Да такіх студэнтаў адносяцца Маеўскі (I курс), Дунке (II курс), Біргер, Каверны (III курс), Еўсеенка, Курчэўская, Нузевіч, Шац (IV курс). Але разам з таварышамі, якія сур'ёзна працуюць, ёсць лодыры. Да лодыраў у першую чаргу можна аднесці Пушкіну (III курс), Пасуднеўскую, Лацкевіч (I курс). Комсамолка Пушкіна адзін прадмет зусім не здала, другі здавала паўторна. Не гледзячы на гэта, яна па чыейсьці міласці стала выдатніцай і нават у ліку выдатнікаў ездзіла на экскурсію ў Ленінград.

На хімічным факультэце з 74 комсамольцаў 31 з'яўляюцца выдатнікамі. Комсамольцы-выпускнікі V курса (комсорг Окунь) здалі прадметы з адзнакай 74,5 проц. выдатна і зараз рыхтуюцца да дзяржаўных экзаменаў. Студэнты Карасіна, Маркевіч, Зайдэль, Залатарэнка сур'ёзна рыхтаваліся да заліковай сесіі і маюць добрыя паказчыкі. Разам з тым комсамольцы Зэлікоівч, Семіжон, Шпілер на працягу першага паўгоддзя мала працавалі над вучэбнай літаратурай і атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

Комсамольская арганізацыя геафака (комсорг Барабан) не зварачвала і зараз не зварачвае патрэбнай увагі акадэмічнай вучобе комсамольцаў. Хаця на геафаку рад студэнтаў — Жахавец, Крышчановіч, Пахімоўскі, Нікалаеў—на працягу ўсяго часу з'яўляюцца выдатнікамі і даюць прыклады сур'ёзнай вучобы, але ў цэлым комсамольская арганізацыя не ўзначаліла барацьбу за выдатную адзнаку, не паставіла ў цэнтр увагі барацьбу за акадэмпаспяховасць.

Комсамольская арганізацыя фізмата (комсорг Фрыд) таксама не ўзначальвае барацьбы за выдатную вучобу. У час заліковай сесіі комсамольцы атрымалі 7,6 проц. нездавальняючых адзнак. Не было ніякай дапамогі з боку комсамольцаў студэнтам першага курса. Акрамя гэтага, трэба ўказаць, што рад студэнтаў і ў тым ліку комсамольцаў маюць вялікую запазычанасць мінулых гадоў. На фізмаце ёсць перадавікі вучобы — Камянецкі, Цыбульскі, Лісаковіч і др.,—але іх вопыт не перадаецца другім.

Комсамольская арганізацыя універсітэта пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі павінна ўзначаліць барацьбу за выдатную вучобу. Вучыцца на выдатна—прамы абавязак кожвага комсамольца.

БОНДАРАЎ.

„Метады" работы Вераскоўскага

Звычайна прынята разумець прэмію, як стымул за прыкладную вучобу і грамадскую работу. Але не так разумее гэта прафорг IV курса хімфака тав. Вераскоўскі. Пасля зімовай заліковай сесіі прафком даў яму ўказанне вылучыць выдатнікаў і лепшых студэнтаў-ударнікаў для прэміравання. Вераскоўскі, не склікаўшы схода студэнтаў курса, самаўласна вылучыў двух студэнтаў, у ліку якіх была студэнтка IV курса Вальковіч. Вальковіч, хаця і атрымала дзве выдатных адзнакі, але яна не з'яўляецца тыпам студэнткі, якую патрэбна заахвочваць і прэміраваць. Працуе над сабой яна надзвычай несур'ёзна, прапрацоўвае матэрыял «абы здаць», прычым здае вельмі часта залікі на шпаргалцы. Да практычных заняткаў адносіцца вельмі халатна.

Трэба яшчэ ўказаць, што Вальковіч з'яўляецца старастай групы, але не вядзе ніякай барацьбы з парушэннем дысцыпліны. У выніку ў групе ёсць многа прагулаў і спазненняў. І, не гледзячы на ўсё гэта, Вераскоўскі вылучыў Вальковіч як выдатніцу для прэміравання, і яна ў час канікул ездзіла на экскурсію ў Маскву.

Вось якія «метады» работы Вераскоўскага. Прафком павінен у далейшым больш уважліва адносіцца да кандыдатур для прэміравання.

Група студэнтаў.

Адказны рэдактар І. ЛЕВІН.

Менск, друкарня «Зязюлі». **Тыраж 1000 экз.** **Гарліт № 2670.**